**ВОДЗЫЎ**

на аўтарэферат дысертацыі Шындлер Эліны Генадзьеўны
"Пластычны фальклор і фальклярызм
у сучасным народным мастацтве Беларусі",
прадстаўленай на суіскание вучонай ступені кандыдата мастацтвазнаўства
па спецыяльнасці 17.00.04 –
выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва і архітэктура

Апошнія дзесяцігоддзі адзначаны павышэннем цікавасці да народнай спадчыны з боку грамадскай супольнасці, што праяўляецца, у тым ліку і ў новых запытах, якія прад'яўляюцца грамадствам да навуковых даследаванняў ў частцы больш грунтоўнага тлумачэння і аналізу мастацкіх працэсаў у галіне традыцыйнай творчасці. Дысертацыя Э. Г. Шындлер з'яўляецца адной з нешматлікіх работ, якія аналізуюць складаныя працэсы трансфармацыі мастацкай формы вырабаў народнага мастацтва і спрыяюць павышэнню мастацкай граматнасці грамадства і папулярызацыі народнай культуры.

Вывучэнне працэсаў фальклярызацыі сучаснага народнага мастацтва з'яўляецца важным у кантэксце праблем адраджэння і захавання традыцыйнай мастацкай спадчыны, у чым праяўляецца актуальнасць дысертацыйнага даследавання Э. Г. Шындлер. Гэта першае даследаванне ў айчынным мастацтве, якое адкрывае напрамкі вывучэння народнага мастацтва, абапіраючыся на катэгорыі «пластычны фальклор» і «пластычны фальклярызм». Такі падыход для айчыннага мастацтвазнаўства з'яўляецца інавацыйным і гэтым вызначаецца навізна навуковай работы.

Узнікненне навацый і выкарыстанне традыцыйных мастацкіх набыткаў для вырашэння сучасных мастацкіх задач – з'ява натуральная, але для больш эфектыўнага вырашэння праблем захавання традыцыйнай мастацкай спадчыны і для больш якаснага развіцця сучасных напрамкаў мастацкай дзейнасці, у тым ліку стылізацый, аўтарскіх інтэрпрэтацый і мастацкага пераасэнсавання народнага мастацтва, мэтазгодным і неабходным з'яўляецца размежаванне розных напрамкаў творчасці, аб'яднаных азначэннем «народнае мастацтва». Вырашэнне згаданай праблемы як раз і прапаноўваецца Э. Г. Шындлер у дысертацыйнай рабоце.

Аўтэнтычныя рысы пластычнага фальклору выяўлены аўтарам на некалькіх узроўнях: на ўзроўні асобных відаў сялянскага мастацтва (ручнога ткацтва, ганчарства, саломапляцення), на ўзроўні мастацкай формы вырабаў (твораў мастацтва) і асобных элементаў мастацкай формы, што з'яўляецца значным унёскам у вырашэнне праблемы захавання аўтэнтычнай мастацкай формы у вырабах сучаснага народнага мастацтва.

Структураванне работы па главах і раздзелах, іх напаўненне і логіка выкладання аналітычнага матэрыялу ў поўнай меры суадносяцца з пастаўленай мэтай і вырашаемымі задачамі дысертацыйнага даследавання. Структура сведчыць пра канцэптуальнае адзінства работы і агульную логіку навуковай ідэі, якая раскрываецца як у тэарэтычных раздзелах дысертацыі, так і ў эмпірычных, якія маюць прыкладную накіраванасць.

Заслугай Э. Г. Шындлер з'яўляецца праведзенае ў рамках дысертацыі апытанне майстроў і мастакоў народнай творчасці, што павышае ступень

даставернасці і навуковай значнасці вынікаў даследавання.

Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні атрыманых вынікаў пацверджаюць сувязь тэарэтычных палажэнняў работы з вырашэннем актуальных праблем у галіне сучаснага народнага мастацтва.

Вынікі даследавання дазваляюць сцвярджаць, што дысертацыя Э. Г. Шындлер «Пластычны фальклор і фалькларызм у сучасным народным мастацтве Беларусі» з'яўляецца самастойнай навуковай работай, аўтар якой заслугоўвае прысваення вучонай ступені кандыдата мастацтвазнаўства па спецыяльнасці 17.00.04 – выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва і архітэктура.

Выказваю згоду на размяшчэнне водзыву на сайце ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі».

Кандыдат мастацтвазнаўства,
дацэнт кафедры этналогіі, музеялогіі
і гісторыі мастацтва БДУ — Томашева І.Р.

« 21 » мая 2024 г.

БГУ
Исторический факультет
ПОДПИСЬ УДОСТОВЕРЯЮ:
Гістарычны факультэт